*Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка*
*Аддзел абслугоўвання і інфармацыі*

# *І будзе слова землякоў гучаць над роднаю старонкай…*

## *творчая сустрэча з літаратарамі-землякамі (Лявон Валасюк, Алесь Паплаўскі)*

*Кобрын 2013*

***Афармленне зала:***

- выстава – панарама “З кніжнага радка” (да 100-годдзя з дня нараджэння С. Грахоўскага);
- адкрытыя прагляды:
- “Праз позірк мастака” (Леанід Валасюк),
- “І пяро – як магчымасць сказаць” (Алесь Паплаўскі),
- “І будзе слова землякоў гучаць над роднаю старонкай” (паэты Кобрыншчыны).

***Абсталяванне***: мультымедыйная ўстаноўка, ноутбук, аўдыязапісы, мікрафоны.

***Форма правядзення***: фармат відэапрэзентацыі.

## І будзе слова землякоў гучаць над роднаю старонкай

*На экране - фота Лявона Валасюка і Алеся Паплаўскага*

***Вядучы.*** Паважаныя сябры! Сёння ў бібліятэку на свята роднай мовы завіталі берасцейскія літаратары, нашы землякі Лявон Валасюк і Алесь Паплаўскі. Гэта людзі актыўнай жыццёвай пазіцыі, якімі, напэўна, і павінны быць пісьменнікі. Нашы госці ахвотна выступаюць на літаратурных імпрэзах, сустрэчах з чытачамі ў бібліятэках, навучальных установах. Вось і зараз мы рады вітаць іх у нашай бібліятэцы.

*Гучыць песня “Мой родны кут, як ты мне мілы (Мой родной край) .(сл. Якуба Коласа, муз. Ігара Лучанка).*

Творчасць паэта, пісьменніка так ці інакш абапіраецца на грунт малой радзімы, тых мясцін, з якіх чэрпаюцца душэўныя сілы, і, магчыма, сюжэты для твораў. І Лявон Валасюк, і Алесь Паплаўскі не парываюць сувязі з роднымі мясцінамі, у сваёй творчасці нярэдка звяртаюцца да роднага краю, да нашай Кобрыншчыны. Адметна, што аўтары перайшлі на родную мову, калісьці яны пачыналі пісаць на рускай мове.

Адведзіны Радзімы:

Пабачыў сваякоў,

Удыхнуў зноў пах лучыны

І лёну ад вятроў…

І сэрца затрымцела…

Нібыта побач усе,

Хто жыў да мяне смела

І хто чакаў мяне.

*Лявон Валасюк*

Кажуць, зноў вясною гэтай

Не цвіла мая каліна.

Мама, ты не вер прыкметам,

Я не стаў чужынцам-сынам.

Я сябе яшчэ не страціў

За будзённай мітуснёю.

Адчыні мне дзверы, маці,

Я даўно не быў з табою.

*Алесь Паплаўскі*

*На экране - фота Паплаўскага , цытата “Веру я – значыць я жыву на адвечнай зямлі пакутнай”(А. Паплаўскі)*

Пачнем нашу сустрэчу з Алеся Паплаўскага, для якога бягучы год стаў юбілейным удвайне: летам ён адзначыў свой 55-гадовы юбілей і ў гэтым годзе выдадзены яго зборнік паэзіі пад назвай “Скрыжалі душы”.

Кароткая біяграфічныя даведка. Аляксандр Феадосьевіч Паплаўскі (Алесь Паплаўскі) нарадзіўся 4 чэрвеня 1958 года ў в. Мазуры Кобрынскага раёна. Пасля заканчэння ў 1975 годзе Шамятоўскай сярэдняй школы вучыўся ў Полацкім лясным тэхнікуме, потым у Беларускім тэхналагічным інстытуце па спецыяльнасці “Лясная гаспадарка”. Працаваў у лягасах Гродзеншчыны і Брэстчыны.

З дзяцінства цягнуўся да літаратуры, пісаў вершы на рускай мове. У 1989 г. абласная газета "Заря" змясціла першы верш Алеся Паплаўскага "Реки изгиб, небес голубизна…"

Пасля ўдзелу ў Рэспубліканскім семінары маладых літаратараў у Іслачы ў 1990 г. Алесь вырашыў пісаць на роднай мове.

*На экране – фота А. Паплаўскага з гітарай.*

У пачатку 90-х Паплаўскага болей ведалі як аўтара і выканаўца бардаўскай песні. Алесь быў адным з актыўных членаў бардаўскай студыі "Вежа". Песенны дар ён атрымаў у спадчыну ад бацькі, вясковага гарманіста. Ніколі не лічыў сябе бардам, але ўпэўнены, што праз вершы, пакладзеныя на музыку, можна данесці да слухача намнога болей.

*На экране – вокладкі кніг А. Паплаўскага.*

Асноўная тэма творчасці Алеся Паплаўскага – чалавек у сучасным грамадстве, яго шляхі, пошук сэнса жыцця. Паэтычныя і празаічныя творы аўтара змяшчалі часопісы "Маладосць", "Першацвет", "Тэрмапілы", "Дзеяслоў", альманах "Жырандоля". Паплаўскі з'яўляецца аўтарам кніг паэзіі "Спынены лістапад" (1987), "Незваротнасць" (2000), "Скрыжалі душы" (2013), кніг прозы "Тэрыторыя скразнякоў" (2004), "Пастка для рэха" (2009).

Алесь Паплаўскі – член Саюза беларускіх пісьменнікаў (2003), лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя У. Калесніка за 2009 год, рэспубліканскай прэміі "Залаты апостраф" за 2012 год.

Ітак, запрашаем да мікрафона Алеся Паплаўскага, паэта, арыгінальнага празаіка, аўтара і выканаўца песен на ўласныя вершы. Алесь Феадосьевіч, хацелася, каб вы расказалі аб сваёй творчасці, можа больш сканцэнтраваліся на новай кнізе "Скрыжалі душы". Калі ласка.

*У мікрафона – Алесь Паплаўскі. Аўтар чытае свае вершы, расказвае аб новай кнізе "Скрыжалі душы", выконвае песні на ўласныя вершы.*

*На экране – фота Л. Валасюка.*

***Вядучы.*** Мастацтва і паэзія – даволі рэдкія з’явы. Мастак цікавы сваімі акварэлямі, карцінамі. Але, калі ён бярэ ў руку пяро, каб выявіць вобразы словамі, ён становіцца ўдвайне цікавым.

Лявон Валасюк – прафесійны мастак-дызайнер. На жыццё паэт-мастак глядзіць у двайным ракурсе, з дзвюх пазіцый, што прыводзіць да адзінай гармоніі.

*На экране –“Натхненне з майстэрні Леаніда Валасюка”, акварэлі мастака.*

Таксама кароткая біяграфічная даведка. Леанід Федаравіч Валасюк нарадзіўся 13 снежня 1955 года ў вёсцы Песцянькі Кобрынскага раёна. Працаваў слесарам на заводзе, служыў у Савецкай Арміі ў Будапешце. У 1981 годзе скончыў архітэктурны факультэт Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. Працаваў на розных пасадах у абласным навукова-метадычным цэнтры культасветработы і народнай творчасці ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама, мастаком-дызайнерам на розных прадпрыемствах горада Брэста. Член грамадскай арганізацыі “Беларускі саюз мастакоў”.

*На экране – вокладкі кніг Л. Валасюка*

У ягоным творчым багажы шмат паэтычных зборнікаў “Блики дня», «Краски души», «Под знаком Стрельца», «Леаніды», «Чырвоная вежа», “Познія сны”, “Знакі на валуне”, кніжкі прозы “Сцежкі да сядзібы” (абразкі маленства).

Адна з галоўных тэм творчасці пісьменніка – тэма малой радзімы, роднай зямлі, адносінаў чалавека да прыроды. Літаратар умее бачыць прадмет у нязвыклым кантэксце. Ён празаік, паэт, аўтар вершаў кароткай паэтычнай формы, праз якую сцісла і ёміста перадае свае думкі, пачуцці, перажыванні.

Паміж радзімаю

І мной –

Прастора часу…

Магчымасці няма



Адмераць

Працягласць часу.

*І яшчэ…*

Невядомасць,

Ціш і тайна…

Нерухомы

Сон быцця…

Крыкне птах.

І гук павісне

Над вясёлкаю

Жыцця…

Лявон Федаравіч, запрашаем да мікрафона. Раскажыце, калі ласка, аб вашых літаратурных арыенцірах, задумах.

*У мікрафона – Л. Валасюк. Прадстаўляе свае вершы, малюнкі.*

*На экране – фотавернісаж “**Паэт. Чытач. Бібліятэка**. ”, на якім дэманструюцца фота з масавых мерапрыемстваў з удзелам мясцовых паэтаў: прэзентацый новых кніг,*

***Вядучы.*** Ад творчасці заўжды натхненне адчуваю,

Цікава вельмі вершы мне складаць,

Ды ў глыбіні душы з трывогаю чакаю,

Чытач што скажа, як пачне чытаць.

…Для чытачоў мой сціплы верш – крыніца ведаў,

Бо з неба ён спадае мне ў душу…

Невыпадкова мы называем нашых мясцовых паэтаў сябрамі бібліятэкі. Менавіта яны з’яўляюцца аўтарамі твораў, якія мы, бібліятэкары, прапануем нашым чытачам; яны - жаданыя госці і непасрэдныя ўдзельнікі бібліятэчных

мерапрыемстваў. Аб гэтым ярка сведчыць фотавернісаж “Паэт. Чытач. Бібліятэка”, які вы зараз можаце бачыць на экране.

*На экране – фотаздымкі вокладак кніг кобрынскіх аўтараў.*

Стала выдатнай традыцыяй праводзіць сустрэчы з новымі кнігамі ў сценах бібліятэкі. У нас адбыліся прэзентацыі першых кніг Леаніда Глушко, Міхаіла Чайнікава, Надзеі Самасюк, Наталлі Кандрашук, зусім нядаўна, у Дзень бібліятэк, прайшла прэзентацыя першага зборніка вершаў Наталлі Цярэнцьевай; мы знаёмім чытачоў з кнігамі і новымі вершамі нашых сённяшніх гасцей Лявона Валасюка і Алеся Паплаўскага, Лідзіі Жук, Любові Шчаслівай, Ігара Сідарука, Наталлі Галаванавай і многіх іншых літаратараў Кобрыншчыны. Значны матэрыял сабраны ў бібліятэцы пра пісьменнікаў-землякоў. Толькі папак-персаналій налічваецца 12. Трэба адзначыць, што літаратурнае краязнаўства цікавіць людзей, асабліва моладзь, вучняў.

З задавальненнем перадаю слова кіраўніку літаратурнага аб’яднання “Белы бусел” Людміле Іванаўне Лазюк. Калі ласка.

*У мікрафона - Л. І. Лазюк, якая прадстаўляе беларускамоўных літаратараў Кобрыншчыны. Гучаць вершы ў выкананні паэтаў.*

***Вядучы.*** Сёняшняя творчая сустрэча з паэтамі-землякамі адбылася ў рамках Свята беларускай мовы “Душа народа – у родным слове”. Мы ўсе адчуваем сваю сувязь з продкамі, з Радзімай, з мовай. Паэты адчуваюць яе асабліва. А мы яшчэ раз на гэтай сустрэчы змаглі ўпэўніцца, якая прыгожая наша родная мова.

«Нам дадзена мова ад Бога,

Каб кожны любіў і ўжываў.

Ды роднага слова жывога

Ніколі нідзе не губляў». *Н. Парчук*

Да новых творчых сустрэч, паважаныя сябры!



***Спіс крыніц***


**Лявон** Валасюк. Алесь Паплаўскі // Літаратурная карта Берасцейшчыны / уклад. А. Крэйдзіч. - Брэст, 2008.- С. 317-319.

**Паплаўскі,** А. Скрыжалі душы : лірыка / Алесь Паплаўскі. – Мінск : “Выдавецкі дом “Звязда”, 2013. – 112 с.

**Валасюк**, Л.. Адведзіны Радзімы / Лявон Валасюк // Заря.- 2013.- 11 апреля. – С. 14.

**Валасюк,** Л. Вершы / Лявон Валасюк // Полымя.- 2011.- № 2.- С.74-78.

**Бурдыка, В.** Шлях на Парнас: таленты зямлі Берасцейскай: [А. Паплаўскі атрымаў абл. літ. прэмію імя У. Калесніка за 2009 г.] / Вячаслаў Бурдыка // Народная трыбуна. - 2009. -5 снежня. - С. 11.

**Грышкевіч, С.** Апраўданне адзіноты, альбо у палоне эгацэнтрызму: [аб нов. кн. А. Паплаўскага “Пастка для рэха”] / Сяргей Грышкевіч // ЛіМ.- 2009.- 31 ліпеня. - С. 7.

**Сянкевіч, М.** “І пяро – як магчымасць сказаць: [аб паэце, аўтары і выкан. песень на ўласн. вершы А. Паплаўскім] / Мікола Сянкевіч // Заря. – 2008. - 16 жніўня. - С. 19.

**Спатканне** з творчымі асобамі // Кобрынскі веснік. - 2006. - 13 мая.

У Залескім СДК адбылася сустрэча “Шчодрая на таленты родная зямля” з пісьменнікамі, якія нарадзіліся на Кобрыншчыне – А. Паплаўскім і Л. Валасюком.

**Новае** выданне // Народная трыбуна.- 2005. - 22 студзеня. - С. 4.

Убачыла свет кніга прозы А. Паплаўскага “Тэрыторыя скразнякоў”.

**Чамярыца, А.** А. Паплаўскі: “Творчасць – неад’емная частка майго жыцця” /А. Чамярыца // Заря. - 2003. - 5 июля. - С. 5.

У Саюз беларускіх пісьменнікаў прынялі паэтаў–землякоў : Івана Лагвіновіча з Баранавіч і *Алеся Паплаўскага* з Брэста.

# І будзе слова землякоў гучаць над роднаю старонкай…

***творчая сустрэча з літаратарамі-землякамі (Лявон Валасюк, Алесь Паплаўскі)***

***Складальнік:***

С. Курачук, *галоўны бібліёграф цэнтральнай раённай бібліятэкі*

225306 вул. Жукава, 12, г.Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка

E-mail kobrin@brest.by
kobrinlib@gmail.com